*Крукоўскі М.І.*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І СУВЕРЭНІТЭТ
(кароткія тэзісы)

1. Заключаная урадам Рэспублікі Беларусь Дамова аб інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй разглядаецца ім як адзін з варыянтаў выхаду з глыбокага сацыяльнага і эканамічнага крызісу, у якім аказалася Беларусь. Згодна гэтай Дамове інтэграцыя плануецца быць вельмі глыбокай, уключаючы аб"яднанне і тэрыторыі, і эканомікі, і фінансаў, і узброеных сілаў, і ўрадавых структур. Але ўсё гэта з адначасовым захаваннем дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, што з"яўляецца характэрнейшай і па-свойму наватарскай рысай азначанай Дамовы. Прычым захаванне суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці разглядаецца як адна з прынцыповых умоў яе рэалізацыі, як conditio sine qua non, што спецыяльна не раз было падкрэслена Прэзідэнтам РБ у яго вусных тлумачэннях сэнсу Дамовы. Пры самых розных агульнапалітычных ацэнках азначанай Дамовы, пачынаючы ад апалагетычных і канчаючы экстрэмальна крытычнымі, так і розных чыста юрыдычных яе аналізах (юрыстам тут сапраўды ёсць над чым падумаць, узяць хоць бы паняцце адзінай дзяржавы з двума ў той жа час суверэнітэтамі), палажэнне аб неабходнасці пры любых умовах максімальна трымацца так цяжка здабытага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь уяўляецца прынцыпова неабходным і правільным. Зыходзячы, напрыклад, з традыцыйнага разумення паняцця "суверэнітэт", у тым ліку і разумення марксісцка-ленінскага, такая глыбокая інтэграцыя пагражае аўтаматычнаператварыць у нішто і суверэнітэт, бо суверэнітэт як юрыдычнае паняцце адносіцца да "надбудовы", якая ў сваю чаргу цалкам залежыць і азначаецца матэрыяльным эканамічным "базісам". З гэтага пункту погляду суверэнітэт становіцца пустою юрыдычнаю формаю, і такая інтэграцыя сапраўды можа разглядацца і ацэньвацца песімістычна як поўная страта незалежнасці Рэспублікі Беларусь на карысць Расійскай Федэрацыі. Аднак, апошняе не зусім адпавядае рэчаіснасці, і для абсалютна песімістычнага адчаю істотных прычын яшчэ, думаецца, няма. Паняцці суверэнітэту і песімізму наогул па свайму сэнсу і эмацыянальнай накіраванасці абсалютна процілеглыя.

2. Сучасная сацыяльная філасофія і сацыялогія у асобе як яе класічных (М.Вэбэр, В.Зомбарт, Р.Тоні, П.Сарокін) так і найноўшых яе прадстаўнікоў (М.Новак, Дж.Ролз, Р.Нейхауз, П.Казлоўскі) сведчаць аб тым, што і так званая надбудова, г. зн., структурна-духоўны фактар, куды безумоўна адносіцца і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суверэнітэт як адно з найважнейшых юрыдычных паняццяў, адыгрывае далёка не апошнюю, а ў часы менавіта выхаду з сацыяльнага крызісу (П.Сарокін) і вядучую ролю, што якраз і мае сёння месца на Беларусі. Гэта перш за ўсё развітая духоўнасць, нацыянальная самасвядомасць і высокая сацыяльная дысцыпліна народа, якая прымае нават этычны характар рэлігійнае веры (Макс Вэбэр) і якая менавіта ў такія крызісныя перыяды аказвае найглыбейшы пазітыўны ўплыў не толькі на дух чалавека, але і на яго матэрыяльную гаспадарча-эканамічную дзейнасць. Азначаны фактар асабліва важны для сёнешняй Беларусі, што якраз і трапіла ў стан такога агульнага сацыяльна-эканамічнага крызісу з прычыны глыбокай дэмаралізацыі і абязбожання савецкага і постсавецкага грамадства.

3. Фактар духоўнасці ў яго больш расшыраным і канкрэтызаваным разуменні ёсць духоўная культура народа як пэўнай канкрэтнай нацыі, у якой праз нацыянальную самасвядомасць якраз і ўвасабляецца яго самастойнае незалежнае светаразуменне і светаадчуванне, яго па сацыяльна-псіхалагічнай тэрміналогіі "Мы-пачуццё". Нацыянальная самасвядомасць насычае рэальнасцю такое найважнейшае паняцце як патрыятызм, якое ў сваю чаргу напаўняе рэальным зместам і юрыдычную форму суверэнітэта. Можна наогул сказаць, што падобна таму, як псіхічна здаровая свядомасць прадстаўляе сабою асноўную ўмову юрыдычнай правадзейнасці індывідуальнага чалавека як поўнапраўнай асобы з яе неад"емнымі правамі чалавека, так і дзяржаўны суверэнітэт наогул з"яўляецца юрыдычным выражэннем самасвядомасці нацыі як поўнацэннага народа з яго гэтак жа неад"емнымі правамі народа на свабоднае і годнае незалежнае існаванне. Паміж правамі чалавека і суверэнітэтам як выражэннем права народу на свабоднае, незалежнае існаванне заўсёды павінен існаваць парытэт, згодна вельмі важнаму сёння і незаўсёды правільна разумстаму прынцыпу сучаснай сацыялогіі. І гэтак жа сама, як структурнае багацце асабістай культуры складае сабою свядомасць індывіда з усімі яго духоўнымі якасцямі, уключаючы і найвышэйшую з іх – <u>патрыятызм</u>, так і ўся духоўная культура нацыі уваходзіць у склад нацыянальнай самасвядомасці, утвараючы сабой рэальны змест і сістэмы не толькі чыста духоўных, але і дзяржаўна-юрыдычных паняццяў і структур, іерархічную піраміду якіх вянчае сабою той жа дзяржаўны суверэнітэт.

4. Духоўная культура нацыі, як вядома, уяўляе сабой іерархічную сістэму з шматлікіх структурных узроўняў, у аснове якой ляжыць нацыянальная мова, гэты, па выразу Хайдэгера, дом нашага духоўнага быцця. Усе без выключэння больш канкрэтныя формы духоўнай культуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народа, калі гэта культура сапраўды створана народам, а не запазычана ці тым болей навязана сазне, рэалізуюцца, пачынаючы з мастацкай літаратуры і канчаючы рэлігіяй, толькі праз нацыянальную мову. Больш таго, мова як сродак рэалізацыі духоўнай культуры, актыўна ўплывае і на культуру матэрыяльную (сацыя-лінгвістычная канцэпцыя Сэпіра-Уорфа). Як чалавек гавора, так бачыць і гэтак жа сама і дзейнічае. Перш чым зрабіць матэрыяльную рэч, чалавек стварае яе ідэальную мадэль у сваёй галаве (Маркс), а гэтая мадэль рэалізуецца і маркіруецца толькі пры дапамозе мовы, гэтай матэрыялізаванай формы свядомасці. Менавіта праз мову духоўная культура ўплывае такім жа творча-актыўным чынам і на эканоміку, пра што пісаў памянёны ўжо Макс Вэбэр. Наогул, зноў такі як паасобны індывід становіцца асобай і можа далей развіваць сваю індывідуальную свядомасць толькі навучыўшыся гаварыць, так і грамадства, народ рэалізуе сваю калектыўную нацыянальную самасвядомасць таксама праз нацыянальную мову. Гэта асабліва істотна для аўтахтонных народаў, сфарміраваных на зыходнай сваёй тэрыторыі і не згубіўшых яшчэ свае падсвядомыя этнічныя і гістарычныя карані (Злучаныя Штаты і лацінская Амэрыка стварылі свае сацыяльныя формы і нацыянальныя дзяржавы на базе хаатычна перамешаных культур народаў-перасяленцаў і абломкаў індзейскіх культур і таму тут не могуць служыць адпаведным прыкладам). Мова, такім чынам, аказваецца адным з найгалоўнейшых элементаў нацыянальнай культуры наогул, адпаведна выступаючы таксама і найважнейшым фактарам захавання дзяржаўнага суверэнітэту. Нездарма ж у Бібліі з вельмі глыбокім сэнсам гаворыцца пра стварэнне Госпадам Богам менавіта розных нацыянальных моў, каб перашкодзіць забыўшым Бога людзям будаваць ўсялякага роду вавілонскія вежы ў выглядзе "інтэрнацыянальных грамадстваў" альбо глабальных каланіяльна-фінансавых імперый.

5. Будучы такой складанай сістэмай, нацыянальная культура вельмі залежыць і ад сацыяльна-гістарычных умоў яе існавання, дасягаючы таго альбо іншага ўзроўню свайго развіцця, факт вельмі важны пры ўзаемадзеянні з пэўнай суседняй блізкай па сваім караням другой культурай. Вядома, што з-за шматвяковага існавання пад уладай спачатку польскай культуры і дзяржаўнасці ва ўмовах канфедэрацыі, а пасля ўжо татальнай дзяржаўнай і культурнай падпарадкаванасці Расійскай імперыі, колішняя еўрапейскага ўзроўню культура Вялікага Княства Літоўскага, у часы яго суверэнітэту і незалежнасці моцна ўплываўшая і на правінцыйна неразвітую тады культуру Маскоўскага княства, аказалася ва ўмовах, прымусіўшых яе фатальна адстаць у сваім развіцці ад бліжэйшых сваіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суседзяў, што трагічна адчуваецца і ў цяперашнія часы. Не сакрэт, што руская культура пасвайму ўзроўню сёння далёка неравышае культуру беларускую і гэта абавязкова павінна было быць кардынальна ўлічана пры заключэнні сёнешняй Дамовы аб інтэграцыі. Узаемадзеянне, ці, як гэта сёння па ініцыятыве ЮНЭСКА называецца, дыялаг культур, асабліва калі яны адносна блізкія па сваіх гістарычных каранях, вельмі тонкі і складаны працэс, у якім больш развітая культура нават несвядома імкнецца асіміліраваць і паглынуць культуру менш развітую, асабліва калі яна мае і чыста механічную перавагу ў колькасці насельніцтва - носьбіта гэтай культуры. У гэтым плане перавага Расіі проста агромністая, і тое з відавочнасцю праяўляецца, напрыклад, у ненармальна пашыраным бытаванні рускай мовы ў гарадох на зыходнай беларускай тэрыторыі. Трэба ўлічваць таксама і той немалаважны факт, што сярод уплывовых сёнешніх расійскіх палітыкаў гэтак жа шырока бытуе няправільнае меркаванне, што беларускі народ – гэта не нацыя, а ўсяго толькі этнас ці нават этнічная разнавіднасць народу рускага, а беларуская мова – усяго толькі мясцовы дыялект “великого и могучего русского языка”. На гэтай аснове адкрыта гаворыцца аб неабходнасці аднаўлення стану былога Савецкага Саюза або, яшчэ горай, Расійскай Імперыі і далучэнні да яе Беларусі ў якасці звычайнай правінцыяльнай расійскай губерніі (Зюганаў, Чубайс і іншыя). Гаворыцца з поўным ужо ігнараваннем праблемы якога б там ні было беларускага дзяржаўнага суверэнітэту ўвогуле.

У гэтых умовах кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, каб захаваць свой уласны статус дзяржаўнага ўраду і статус Беларусі як суверэннай Рэспублікі, а не расійскай губерніі, павінна праводзіць палітыку спецыфічнага <u>пратэкцыянізму</u> ў адносінах да сваёй нацыянальнай культуры, як тое рабілася часам і робіцца ў сферы культуры матэрыяльнай, калі, напрыклад, адносна больш моцная прамысловасць суседняй краіны пагражае цалкам запоўніць сваімі больш таннымі таварамі рынак прамыслова слабейшай краіны і тым самым канчаткова задушыць уласную яе эканоміку. Тое, дарэчы, абавязкова будзе мець месца і ў эканамічных адносінах ва ўмовах інтэгрыраванага суіснавання Беларусі і Расіі, асабліва калі ўлічваць асабістыя схільнасці і погляды большасці яе так званых алігархаў. І калі сапраўды існуе намер захаваць у гэтых абставінах беларускі суверэнітэт, то тым болей павінен праводзіцца сваеасаблівы культурны пратэкцыянізм і ў духоўнай і ў матэрыяльнай галінах беларускай нацыянальнай культуры, пратэкцыянізм, які можа ў пэўных выпадках прымаць і жорстка прымусовы характар, як тое здараецца, напрыклад, у дзейнасці мытнай службы. Пратэкцыянізм у сферы духоўнай культуры

перш за ўсё, зразумела, павінен быць здзейснены ў факце ўвядзення адзінай дзяржаўнай беларускай мовы, у развіцці беларускай рэлігіі, філасофіі, навукі, мастацтва і г. д., не губляючы з поля зроку ўзор агульначалавечай культуры. Тут абавязкова трэба, каб роля дзяржавы кантраліравала і рэгулявала рынечныя адносіны ў сферы духоўнай культуры, без чаго гэта сфера, як паказала практыка, абавязкова прыходзіць у заняпад. Наогул, у гэтым сэнсе духоўная культура чымсьці нагадвае сістэму ўзброеных сіл: калі вялікія дзяржавы ў сваёй палітыцы абапіраюцца пераважна на гэтыя апошнія, то дзяржавы малыя ў якасці апоры маюць высокі маральны дух і патрыятызм, што разумеў ужо Арыстотэль. І пагэтаму як там, так і тут, у сферы культуры рынечная стыхія павінна кантраліравацца і рэгулявацца дзяржавай. Пратэкцыянізм павінен праводзіцца і ў адносінах з іншымі культурамі, каб захаваць роўнаправнасць культуры беларускай, улічваючы, зразумела, рэальны стан азначаных суадносін і арыентуючыся пры гэтым як на ідэальны ўзор на узровень агульначалавечай культуры і на вядомую Дэкларацыю .

6. Маючы такое фундаментальнае значэнне для незалежнага існавання народа і яго дзяржавы і ў той жа час вылучаючыся сваёй глыбінёй і складанасцю, нацыянальная культура з мовай як "домам яе духоўнага быцця" не можа быць уведзена толькі нейкім аднаразовым актам, а тым болей ў юрыдычна-прымусовым дзяржаўным парадку. Дзяржава, зацікаўленая ў захаванні свайго суверэнітэту, безумоўна абавязана развіваць сваю культуру і садзейнічаць нармальнаму яе функцыянаванню і шляхам паступовага адукацыйна-выхаваўчага працэсу, здзяйснянага на ўсім дыяпазоне яе адукацыйна-выхаваўчых структур, пачынаючы ад дзіцячых садкоў і канчаючы сістэмай спецыяльных вышэйшых навучальных устаноў, перш за ўсё, зразумела, уводзячы ў пастаяннае карыстанне нацыянальную беларускую літаратурную мову. Праз мову чалавек атрымлівае увесь абсяг сваёй роднай культуры, так што ў выніку як чалавек гаворыць, так думае, і, больш таго, як мы бачылі, гэтак жа сама і дзейнічае. Толькі валодаючы ўсім аб"ёмам роднай нацыянальнай культуры чалавек можа быць поўнацэнным грамадзянінам сваёй незалежнай, суверэннай дзяржавы. Гэта перш за ўсю адносіцца да сістэмы агульнага выхавання і адукацыі, бо менавіта гэтая сістэма прызваная выхоўваць і фармаваць чалавека як грамадзяніна і патрыёта сваёй айчыны. Тут павінна быць не толькі высокаякаснае гуманітарнае выхаванне, але і колькасна высокі адносны яго адсотак (у школе савецкага ўзору, напрыклад, занадта шмат часу аддавалася вывучэнню прыродазнаўчых і навукова-тэхнічных дысцыплін за кошт дысцыплін гуманітарных). Але гэтак жа важным з"яўляецца тое і для сістэмы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшага спецыяльнага навучання. Улічваючы неабходнасць вышэйпамянёнага спецыфічнага пратэкцыянізму, прыдзецца таксама больш часу ахвяроўваць тут гуманітарным прадметам з абшару менавіта беларускай нацыянальнай культуры нават у чыста прыкладных тэхнічных навучальных установах, бо даўно ўжо вядома, што чалавек, пазбаўлены ведаў у сферы духоўнай культуры і калі ён не патрыёт сваёй дзяржавы, як правіла дрэнны спецыяліст і ў канкрэтнай сваёй прафесіі, што даўно ўжо ўлічваецца, напрыклад, сістэмай адукацыі Злучаных Штатаў Амерыкі. Суверэнітэт сваёй дзяржавы трэба ўвесь час берагчы і абараняць, бо, як сведчыць і старажытная і навейшая гісторыя, невялікія краіны заўсёды трымаліся і трымаюцца не столькі ваеннай сілай, колькі сваім высокім патрыятычным духам. Гэтым духам павінна быць насычана ўся сістэма адукацыі і выхавання, не абмяжоўваючыся толькі праслаўтым "беларусазнаўствам", якое нагадвае ў нас адпаведныя прадметы па этнаграфіі ў амерыканскіх універсітэтах, што вывучаюць мізэрныя астаткі індзейскіх культур у сумна вядомых рэзервацыях.

7. Побач з агульнай такой мэтанакіраванасцю ўсяе сістэмы адукацыі і выхавання, важную ролю тут павінны адыгрываць і канкрэтныя ВНУ з шырокай сацыякультурнай прафарыентацыяй: гуманітарныя факультэты агульных універсітэтаў і спецыяльныя навучальныя установы тыпу кансерваторый, мастацкіх акадэмій, тэатральных інстытутаў і падобных ім іншых ВНУ. Асабліва ж вялікае значэнне мае тут агульнарэспубліканскі ўніверсітэт культуры як установа, дзе як бы факусіруецца ўся адукацыйна-выхаваўчая і навукова-даследчая дзейнасць у сферы нацыянальнай культуры. У гэтым аспекце ролі іх нават важнейшая, чым роля, напрыклад, такіх вузкаспецыялізаваных устаноў, як кансерваторыі або мастацкія акадэміі. Калі, напрыклад, кансерваторыя ўсё ж такі мае сваёй мэтай падрыхтоўку вузкапрафесійнага спецыяліста ў сваёй сферы, то музычная падрыхтоўка ў сістэме універсітэта культуры мае прамой сваёй задачай рыхтаваць спецыяліста шырокага культуразнаўчага профілю, здольнага ўвязваць сваю прафесійную дзейнасць непасрэдна з задачамі адраджэння і нармальнага функцыянавання нацыянальнай беларускай культуры ў цэлым. Тое ж самае трэба праводзіць і ва ўнутранай арганізацыйнай структуры самога ўніверсітэта ў сістэме ўзаемадзеяння паміж асобнымі яго факультэтамі, кафедрамі і г.д. Думаецца, так менавіта ў прынцыпе павінна рашацца ў нас найактуальнейшая сёння праблема ўзаемаадносін паміж нацыянальнай культурай і дзяржаўным суверэнітам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ